*Энгельс Дарашэвіч*

## ПЕРСПЕКТЫВЫ КУЛЬТУРНАЙ АНТРАПАЛОГІІ Ў ВЫВУЧЭННІ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

*У артыкуле разгледжаны шэраг праблем айчыннай тэорыі і гісторыі культуры, вырашыць якія ў дачыненні да народнай культуры і на канцэптуальным, і на ўжытковым (практычным) узроўні можна з дапамогай культурнаантрапалагічных падыходаў, метадалогіі і метадаў.*

*Engels Darashevich*

## PERSPECTIVES OF CULTURAL ANTHROPOLOGY IN THE STUDY OF FOLK CULTURE OF BELARUSIANS

*The article describes a number of problems of the domestic theory and history of culture. It is possible to decide them in relation to popular culture and on the conceptual and applied (practical) level with the use of culture-anthropologic approaches, methodologies and techniques.*

У даследаванні культуры нашай краіны (і ўрбанізаванай, і традыцыйнай) сёння актыўна выкарыстоўваюцца такія навуковыя напрамкі, як *сацыялогія, культуралогія, мастацтвазнаўства, паліталогія*. Усё яшчэ ў занядбаным стане знаходзіцца даследчы патэнцыял *культурнай антрапалогіі*, асабліва ў плане даследавання каранёвай культуры беларусаў. Хаця ў айчынай навуцы былі і ёсць даследчыкі, якія адчулі патэнцыял антрапалогіі і карысталіся яе напрацоўкамі. Мая калега па Нацыянальнай акадэміі навук Зінаіда Мажэйка ў кнізе «Каляндарна-песенная культура Беларусі» [3] падкрэсліла, што для якаснага вывучэння традыцыйнай культуры «неабходныя экспедыцыі сацыялагічнага напрамку са стацыянарным даследаваннем найбольш спеўных вёсак метадам «уключанага назірання» (па тэрміналогіі сацыёлагаў)» [3, с. 10]. Гэта значыць – з выкарыстаннем асноўнага метаду *сацыякультурных антраполагаў* – метаду ўключанага назірання.

Культурнай антрапалогіі – «няма» без *экспедыцыйнай дзейнасці*: гэта – «крэда» ды «альфа і амега» гэтай навукі, якая дае рэальныя веды пра чалавечыя супольнасці, што існуюць у «рэальным часе» без схаластычных і тэндэнцыйных адхіленняў у ідэалогію, паліталогію і сацыяльны папулізм. Магчыма, менавіта таму яна з’яўляецца абавязковым прадметам для вывучэння ў большасці вышэйшых навучальных установаў Еўропы і ЗША, дзе прызвычаіліся аплочваць толькі відавочна карысную для будучай прафесійнай самарэалізацыі, сацыялізацыі і інкультурацыі студэнтаў адукацыю. Праз выкладанне на кафедры этналогіі БДУКМ я пераканаўся, што непасрэдны кантакт у час экспедыцыі з носьбітамі традыцыі дае будучым спецыялістам па культуры і мастацтве ў разы больш сацыяльна карысных ведаў, уменняў і навыкаў, чым самае лепшае тэарэтызаванне. А менавіта ў набыцці гэтага – сэнс адукацыі.



Малюнак 1 – Удзельніца курсавога калектыва «Ра́ме» К. Войцік у экспедыцыі, Стаўбун. 2015




Малюнак 2 – Гурт «Ра́ме» (кіраўнік В. Калацэй, студэнты кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ К. Войцік, К. Мельнікава, В. Верас), які пераняў у экспедыцыях фальклорныя ўзоры, на прэстыжным міжнародным фальклорным конкурсе, Санкт-Пецярбург, СПбІК. 2016


СВИДЕТЕЛЬСТВО

*о присуждении поощрительной премии*

**фольклорному ансамблю "Раме"**

учреждения образования "Белорусский государственный университет культуры и искусств", лауреату Пятого международного фестиваля-конкурса народного песенного искусства "Как на речке было на Фонтанке", диплом II степени (Россия, 2016 год), руководитель – Калацей Вячеслав Викторович

Президент Республики Беларусь А.Лукашенко

2017

Малюнак 3 – Пасведчанне аб прысуджэнні прэміі Фонду па падтрымцы таленавітай моладзі гурту «Ра́ме» кафедры. 2017

Дакрануўшыся да аўтэнтычнага фальклору ў антрапалагічнай экспедыцыі (з удзелам у абрадавых практыках), непасрэдна на месцы бытавання традыцыі (мал. 1), нашы студэнты, пераняўшы рэгіянальны фальклор метадам «дэманстратыўнай антрапатэхнікі», дастойна яго прадстаўляюць на самых разнастайных сучаных пляцоўках (мал. 2). Яны выклікаюць гэтым сацыяльнае прызнанне і сваёй дзейнасці (набытых фалькларыстычных ведаў, уменняў, навыкаў), і аўтэнтычнага фальклору беларусаў, з якім пазнаёміліся ў непасрэдным асяродку яго бытавання. У такой **мадэлі навучальнага працэсу** (*экспедыцыя → яе вынікі як дыдактычны матэрыял падрыхтоўкі спецыялістаў → пабудаваны на экспедыцыйных матэрыялах дыпломны праект*) [2] – прынцыповы выбар прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры і, што надзвычай важна для фарміравання навуковай школы, – павага да навуковага тэстаменту аўдыявізуальнага антраполага Зінаіды Мажэйкі (1933–2014). Яна (разам з філосафам У. Кананам і эстэтыкам М. Крукоўскім) шчыра вітала ўсе этапы станаўлення этнамастацкай адукацыі ва БДУКМ увогуле і на кафедры этналогіі і фальклору ў прыватнасці: і ў час абароны кандыдацкай дысертацыі майго аспіранта, сённяшняга загадчыка кафедры В. Калацэя (1999); і ў час першага набора на «Этнафоназнаўства» курса артыста-вакаліста вышэйшай катэгорыі Т. Пладуновай (2004); і ў няпросты для кафедры час абароны ад непрафесійнай і недальнабачнай адміністрацыі ўніверсітэта (2011); і ў час супрацоўніцтва з фальклорным праектам «Берагіня» (з 1999 года) М. Козенкі і РГА «СЭТ», які узначальваў А. Глушко (да 2017 года). «Благаславенне»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследчыцы, якая ўключана Кембрыджскім біяграфічным інстытутам у спіс «200 вядучых жанчын-інтэлектуалаў свету» [4], у жо многа гадоў дадае шмат вагі, прызнання і падтрымкі нашым мэтанакіраваным намаганням у «антрапалагізацыі» даследчай і адукацыйнай дзейнасці па захаванні народнай культуры беларусаў у краіне і па-за яе межамі.

*Культуралогія,* якая прэтэндуе на якасны і аб'ектыўны аналіз форм і зместу культур чалавецтва, сёння існуе толькі на постсавецкай прасторы. На мой погляд, – таму, што яна грунтуецца, фактычна, на спробах абстрактнага даследавання тэорыі і гісторыі культуры, якія выкладаюцца ў большасці вядучых універсітэтаў свету паасобку – як: а) гісторыя культуры і мастацтва; б) агульная тэорыя культуры. Гэтыя філасафічныя, элітарныя, вельмі складаныя дысцыпліны патрабуюць і паасобку досыць глыбокага вывучэння. У Беларусі ды некаторых суседніх краінах яны недальнабачна «зліваюцца» і ператвараюцца ў нібыта сінкрэтычную дысцыпліну для шырокага ўжытку і выкладання, але (на жаль) – з недастаткова паслядоўнай і канцэптуальна прапрацаванай метадалогіяй. У апошнюю (у сілу яе аморфнасці і недакладнасці ў культуралогіі) трапляюць многія элементы філасофіі, мастацтвазнаўства, этналогіі, сацыялогіі, паліталогіі і – антрапалогіі. Мне падаецца – таму, што навукоўцы-культуролагі так і не вырашылі, у рэшце рэшт, што яны даследуюць: светапогляд і паводзіны; шэдэўры і стандартныя артэфакты матэрыяльнай культуры; узаемадачыненні гэтага ўсяго з актыўнасцю носьбітаў культуры-прадстаўнікоў пэўных (заўсёды знітаваных з дакладна-этнічным светапоглядным і матэрыяльным бэкграўндам) асобных чалавечых супольнасцей.

Насамрэч, гэтыя часткі культуралогіі (і гісторыя культуры ды мастацтва, і агульная тэорыя культуры) сёння патрабуюць сапраўднай сціслай навуковай рэфлексіі выключна паасобку, бо «злітыя» разам адвабліваюць ад канкрэтыкі культуры пэўнага этнасу, народа, нацыі. У гэтым кантэксце праблем у нашай айчыннай культуразнаўчай навуцы – бездань. Але мы, замест іх вырашэння, імкнёмся: а) маніпуляваць ужо даўно вядомымі і досыць адвольна аб'яднанымі ў парадыгму падыходамі розных замежных даследчыкаў да іх культур з мэтай – не спасціжэння і пераймання ўласнай культуры, – а яе абстрактнага тэарэтызавання «на фоне» суседніх; б) выкладання яе быццам бы глыбіннех (насамрэч жа – схаластычна трактуемых) асноў ды зместу – без суаднясення з канкрэтнай формай. Пры гэтым ігнаруецца, што форма культуры – гэта заўсёды паводзіны пэўнай супольнасці, з'яднанай агульным светапоглядным і матэрыяльным бэкграўндам. А менавіта на вывучэнні гэтых паводзінаў засяроджаны антраполагі ў сваіх экспедыцыях… Абагульняюць і сістэматызуюць іх яны толькі ПАСЛЯ эмпірычнага экспедыцыйнага даследавання.

У айчыннай тэорыі і гісторыі культуры, на распрацоўку якой прэтэндуюць культуролагі (і ў нейкай ступені – філосафы, мастацтвазнаўцы, этнолагі ды палітолагі), ёсць вельмі важныя праблемы, ігнараваць якія на сучасным этапе станаўлення Беларусі як унітарнай і суверэннай краіны з самадастатковай культурай – небяспечна, асабліва з улікам нашага геапалітычнага становішча. Вырашыць такога кшталту праблемы (пералічаныя ніжэй у пунктах I–IV) у дачыненні да народнай культуры і на канцэптуальным, і на ўжытковым (практычным) узроўні можна толькі з дапамогай культурна-антрапалагічных падыходаў, метадалогіі і метадаў.

I. Адной з істотных з'яўляецца *праблема вызначэння ролі фальклору і традыцыйнай культуры ў фарміраванні і развіцці нацыянальнай беларускай культуры* ў складаным дынамічным узаемадзеянні з іншымі культурамі суседніх вялікіх і малых краін, аўтахтонных і міграцыйных супольнасцей і этнасаў. На жаль, у большасці культуралагічных даследаванняў традыцыйная культура беларусаў «па змаўчанні» светапоглядна «загнаная» ў «рэзервацыю» фармальна трактуемых паводзінных праяў, што распадаюцца пад уціскам глабалізацыі вясковых супольнасцей часоў індустрыялізацыі і сённяшняга часу «прадчування інфармацыйнага грамадства». Традыцыйная культура «выціскаецца» з інфармацыйнай, навуковай і адукацыйнай прасторы краіны, а яе «нішу» ў светапоглядзе і паводзінах займаюць рознага кшталту фантомы, такія, як «культура мира», ролевыя гульні, праектная дзейнасць і інш. Пры гэтым не ўлічваецца тыпалогія, аксіялогія, рэальны ўзрост і багатая разнастайнасць спадчыны айчыннай руральнай культуры. Яе даследчыкі не рупяцца як след распытаць носьбітаў, «ужыцца» ў іх светапогляд і адаптацыйныя мадэлі; аддаюць перавагу павярхоўнаму рэферыраванню часам не зусім дасканалых даследаванняў народазнаўцаў XIX–XX стагоддзяў; не ўлічваюць напрацоўкі замежных даследчыкаў XX і XXI стагоддзяў, у свой час «адмежаваных» ідэалагічнай «жалезнай завесай» ад айчыннай навуковай традыцыі. Разам з тым каранёвая культура, фальклор даўно прызнаныя міжнароднай супольнасцю «нематэрыяльнай культурнай спадчынай чалавецтва».

II. На якасць вынікаў штудый канцэптуальных аналітыкаў айчыннай народнай культуры ўплывае *праблема адсутнасці сістэмных эмпірычных даследаванняў культуры* (якіх няма ў культуралогіі, і якія – абавязковы стартавы этап у культурнай антрапалогіі) з іх *наступным абагульненнем на падмурку ўніверсальнай, добра адпрацаванай парадыгмы*. Культурная антрапалогія з'яўляецца зручнай падставай для паспяховых даследаванняў паводзін і светапогляду як тытульнага этнаса, так і ўсіх астатніх этнасаў і сацыяльных груп краіны. Пры гэтым эмпірычныя даследаванні метадам «уключанага назірання» з'яўляюцца асновай аб'ектыўнага і паспяховага збору навуковых дадзеных, а ўніверсальнасць метадалогіі (антраполагі даследавалі грамадствы і супольнасці ўсіх кантынентаў Зямлі і іх аналітычны «апарат» сапраўды ўніверсальны) вырашае праблему абагульненняў і верыфікацыі высноў даследавання.

III. У перыядычных спробах «заігрывання» айчынных культуролагаў з антрапалогіяй мае месца і *праблема атаясамлівання культурнай антрапалогіі і гісторыі культурна-антрапалагічнай думкі.* Культурная антрапалогія мае сваю спецыфіку ў параўнанні з культуралогіяй. У сілу сваёй універсальнасці (аб'ектыўнага добра метадалагічна абгрунтаванага погляду на любыя культуры і этнасы) яна з'яўляецца ў тым ліку (на этапе кампаратыўнага даследавання і фінальных даследчых высноў) і – тэарэтычнай галіной ведаў, што ранжыруе культуры па іх тыпалогіі, прыярытэтах, накіраванасці і г.д. Але гэтыя высновы робяць у дачыненні да канкрэтнай культуры (няхай і на фоне іншых), у асяродку якой праведзены эмпірычныя даследаванні. Агульныя ж разважанні пра тое, што нехта некалі казаў пра іншыя культуры (што любяць рабіць культуролагі) антраполагаў (без прыкладання да матэрыялу культуры, якія яны даследуюць эмпірычна) не цікавяць. Гэта – ўвогуле «парафія» гісторыкаў навукі, хутчэй – бібліятэкараў і архівістаў, а не антраполагаў, якія працуюць «у полі» ці, як яшчэ кажуць, «на зямлі».

IV. Апошнім часам усё больш надзённай з'яўляецца праблема *адсутнасці сінхранізацыі айчыннага тэарэтычнага і практычнага культуразнаўства, накіраванага на фальклор.* Сувязь прыродазнаўчага і культуразнаўчага фактараў у традыцыйнай культуры трэба даследаваць з пазіцыяй культурнай антрапалогіі, распрацоўваць канцэпцыі і шляхі «інтэграцыі» традыцыйнай культуры і фальклору ў сучасныя эканамічныя адносіны, а не музеефікацыі іх. Але гэта, на жаль, у дастатковым маштабе сёння адсутнічае. Так, у БДУКМ на факультэце культуралогіі па спецыяльнасці менеджмент займаецца прыкладна 600 чалавек (на вочнай і завочнай форме навучання), але зусім адсутнічае напрамак, які можна было б назваць «менеджмент



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклору». Як сведчыць сусветны досвед, болшасць антраполагаў пасля даследавання традыцыйных культур займала актыўную пазіцыю па іх адаптацыі да сучаснасці, распрацоўвала спецыяльныя праграмы, абгрунтоўвала для муніцыпалітэтаў, урадаў, міжнароднай супольнасці неабходнасць фінансавання такой дзейнасці.

Нам падаецца абсалютна жыццёва неабходным рыхтаваць культурных антраполагаў у БДУКМ, і таму патрэбна магістратура і аспірантура па гэтай спецыялізацыі, асабліва – на кафедры этналогіі і фальклору. Патрэбна планаваць дастаткова шырокія даследаванні ў адзінстве культурнай антрапалогіі, сацыялогіі і аксіялогіі. Трэба выкарыстаць і ўжо існуючыя ў гэтым напрамку некаторыя дасягненні, асабліва – тэзаўрусныя метады аналізу фальклору і мадэль падрыхтоўкі спецыялістаў па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ.

**Спіс літаратуры:**

1. Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард ; пад рэд. П. Царашковіча. – Мінск : Тэхналогія, 1995. – 478 с.
2. Кафедра этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў : буклет / укл. В. Калацэй, маст. афармл. В. Красулін. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 2 с.
3. Можейко, З. Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт систем.-типол. исслед. / З. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.
4. Можейко, З. Экология традиционной народно-музыкальной культуры: нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем / З. Можейко. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 147 с.

***Юрий Бундин***

## СОЦИОНОРМАТИВНОЕ СОДЕРЖАНИЕ ФОЛЬКЛОРА

*В статье выдвинут тезис, согласно которому следование традиционным нормам обычного права (бытующим в народной художественной культуре) в условиях переходных общественных моделей позволяет обеспечивать стабильность, регулировать межнациональные и этно-религиозные конфликты.*

***Yuri Bundin***

## SOCIO-NORMATIVE CONTENT OF FOLKLORE

*The author of the article put forward the thesis that following the traditional norms of customary law (existing in folklore) in conditions of transitional social models allows to ensure stability, regulate interethnic and ethno-religious conflicts.*

В своей программной статье министр иностранных дел Российской Федерации С.В. Лавров отметил, что в условиях кризиса либерально-капиталистической модели «глобального лидерства» решение проблем современного мира может быть обеспечено только через сотрудничество ведущих государств, учитывающее многоцветие современного мира, его культурно-цивилизационное многообразие. Успех такого взаимодействия возможен только на основе партнерства цивилизаций, опирающегося на уважительный полилог различных культур и религий, и его интегративное качество – общечеловеческую солидарность, имеющую нравственную основу, формируемую традиционными ценностями [2].

Сказанное побуждает вновь поставить вопрос о социальной роли фольклора, народной художественной культуры в целом в современном общественном развитии. Сегодня в общественном сознании продолжает доминировать точка зрения материалистического понимания истории, согласно которой фольклору отводится место пережитка прошлого, музейно-этнографического артефакта, источника сведений о возникновении и развитии народного художественного творчества, об этнической характеристике локальной группы с эстетической доминантой историко-художественной ценности, как увеселительной и развлекательной компоненты праздничных гуляний [5]. Характерно, в этой связи, мнение известного советского фольклориста А.И. Никифорова: «Сказки – это устные рассказы, бытующие в народе с целью развлечения, имеющие содержанием необычные в бытовом смысле события (фантастические, чудесные или житейские) и отличающиеся специальным композиционно-стилистическим построением» [4, с. 5–7].

Как следствие, научные исследования фольклора носят, в основном, либо этнографический характер в качестве признака этнолокальной группы, либо поэтический – как историческая форма художественного творчества, предшествовавшая современным видам и жанрам искусства. В обоих случаях фольклор рассматривается как артефакт, место которому сегодня отводится в музейных резервациях, культурно-просветительских и досугово-развлекательных сферах.

Следует отметить, что в обоих направлениях исследований, в том числе междисциплинарных, указывается ценностно-смысловое содержание произведений аутентичного фольклора, однако специальное внимание анализу его природы и социального назначения практически не уделяется. Определенное исключение делается в историко-юридических исследованиях, где фольклору отводится роль памятника обычного права. При этом фольклор практически не изучается как универсальный социальный регулятор совместной жизни и деятельности людей, как основной, наряду с религией, носитель и транслятор норм морали, определяющих ту самую нравственную основу, формируемую традиционными ценностями.

В то же время, по нашему мнению, существует генетическая связь искусства и права как форм отражения и преобразования процессов социального развития, как соотношение этического (юридического) и эстетического в совместной жизни и деятельности людей. Отказ от парадигмы исторического материализма, рассматривающего мифопоэтическое мышление и связанную с ним традиционную художественную культуру в качестве пережитка прошлого, раскрывает новые возможности в исследовании роли и места фольклора в развитии современных обществ.

Имеются основания утверждать, что фольклор возник и развивался именно как универсальный регулятор общественной жизни. Выделяемые сегодня в качестве относительно автономных форм общественного сознания искусство и право имеют единую социальную природу, которая коренится в мифоритуальной культуре, ее праздничной обрядовости – первой форме духовной жизни древнего человека. Именно празднично-обрядовые действия имели своей целью сплотить архаические племена в целостные социальные образования и обеспечить их выживаемость в противостоянии с силами природы. Основатель французской социологической школы Э. Дюркгейм в своих исследованиях обращал внимание, что

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ